Источник: "Беларускі гістарычны часопіс" - 2012-08-17



Канстанцін КАРПЕКІН

# Змены ў становішчы іўдзейскага культу ў БССР ва ўмовах савецкай антырэлігійнай прапаганды (1919—1939 гг.)

*Дзяржаўная антырэлігійная палітыка ў СССР мела свае асаблівасці ў дачыненні да розных канфесій. Самай распаўсюджанай рэлігіяй у БССР пасля хрысціянства быў іўдаізм. У дачыненні да яго дзяржава распрацоўвала спецыфічныя метады і мерапрыемствы.*

Насельніцтва, якое пражывала на беларускіх землях у канцы XIX—пачатку XX ст., з'яўлялася полiканфесійным. Можна меркаваць, што яно мела розную ступень рэлігійнасці: пэўная частка насельніцтва імкнулася максімальна прытрымлівацца рэлігійных канонаў, іншая ж абмяжоўвалася выкананнем асноўных абрадаў ці залічвала сябе да пэўнага веравызнання паводле фармальных прыкмет. У часы Расійскай Імперыі ролю дзяржаўнай рэлігіі адыгрывала праваслаўе. Пасля ўсталявання ў кастрычніку 1917 г. савецкай улады на чале дзяржавы аказаліся прыхільнікі атэізму. Распачатая бальшавіцкім урадам палітыка аддзялення царквы ад дзяржавы мела выразную антырэлігійную скіраванасць і праявілася ў масавым закрыцці культавых будынкаў і рэлігійных навучальных устаноў, рэпрэсіях супраць духавенства, разгортванні атэістычнай прапаганды. І такая палітыка ў розных формах праводзілася супраць усіх рэлігійных плыняў.

У красавіку 1923 г. на XII з'ездзе РКП(б) была прынята рэзалюцыя "Пра пастаноўку антырэлігійнай агітацыі і прапаганды", у якой гаварылася, што члены партыі павінны прымаць захады па *"канчатковым разбурэнні рэлігійных вераванняў ва ўсіх відах"*, *"выкрываць кожнаму рабочаму і селяніну ману і супярэчанне яго інтарэсам усялякай рэлігіі"*[1].

Адзначым, што атэістычная прапаганда супраць кожнай рэлігіі мела сваю спецыфіку, абумоўленую асаблівасцямі канкрэтных вераванняў. Такая сітуацыя была характэрна і для тэрыторыі Беларусі, дзе пражывалі прадстаўнікі розных веравызнанняў.

Пераважная большасць насельніцтва БССР спавядала хрысціянства (праваслаўе, каталіцызм, пратэстанцызм). Другой па колькасці вернікаў рэлігіяй з'яўляўся іўдаізм. Паводле стану на 1 студзеня 1925 г., 10,88% ад агульнай колькасці насельніцтва БССР складалі яўрэі[2]. Яўрэйскі рэлігійны культ распрацоўваўся на працягу стагоддзяў і ўяўляў сабой складаную сістэму традыцый. Назавём асноўныя з іх, супраць якіх у акрэслены перыяд праводзілася прапаганда. Адной з галоўных была надзвычайная павага да *шабату* (суботы). Субота ўспрымалася вернікамі



***КАРПЕКІН Канстанцін Рыгоравіч.***

*Галоўны захавальнік фондаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, аспірант Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Нарадзіўся ў 1985 г. у в. Якубаўшчына Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці. У 2007 г. закончыў гістарычны факультэт, у 2008 г. — магістратуру Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М.Машэрава. Даследуе дзяржаўную палітыку ў адносінах да іўдзейскіх абшчын Беларусі ў 1917—1939 гг. Аўтар больш за 40 навуковых і краязнаўчых публікацый.*



Канстанцін Карпекін. Змены ў становішчы іўдзейскага культу ў БССР ва ўмовах савецкай антырэлігійнай прапаганды

як пастаянная падрыхтоўка да прыходу Машыаха (Збавіцеля), з якім звязвалі ўсталяванне ўсеагульнай гармоніі. У шабат вернікі павінны былі прысвячаць увесь свой час духоўнаму самаўдасканаленню і малітвам. Шабат быў сімвалам адметнасці і еднасці яўрэйскага народа. У гэты дзень забаранялася працаваць і нават карыстацца грамадскім транспартам.

Акрамя таго, у іўдзейскім календары мелася дастаткова шмат святаў, паходжанне якіх было звязана з пэўнымі падзеямі яўрэйскай гісторыі. Найбольш значнымі для кожнага іўдзея з'яўляліся навагоднія святы і Песах, бо менавіта яны ў свядомасці яўрэяў выразна замацоўвалі палажэнне пра богавыбарнасць яўрэйскага народа. Год, згодна з іўдзейскай традыцыяй, пачынаўся ў канцы верасня — пачатку кастрычніка ў дзень *Рош-Гашана* (Судны дзень). Яўрэі верылі, што ў гэты час прадвызначаецца іх лёс на ўвесь будучы год. Праз дзесяць дзён святкаваўся *Іом-Кі-пур* (Дзень збавення), калі вернікі прасілі Бога і бліжніх дараваць ім усе кепскія ўчынкі. *Песах* з'яўляўся самым старажытным іўдзейскім святам і адзначаўся ў сакавіку—красавіку ў гонар зыходу яўрэяў з егіпецкага палону. Адной з адметных рытуальных страў, якія выраблялiся менавіта для Песаху, з'яўлялася маца — печыва ў выглядзе тонкіх пласцінак. Асаблівасць яе прыгатавання ў тым, што цеста абавязкова павінна быць прэсным. Маца такім чынам з'яўлялася сімвалам зыходу яўрэяў з Егіпта — настолькі хуткага, што нават замешанае для выпечкі хлеба цеста не паспела забрадзіць.

Таксама іўдзеі адзначалі такое свята, як *Сукот* (Шалашы), калі на працягу тыдня яўрэі павінны былі жыць у спецыяльна зробленых буданах — у памяць пра часы, калі іх продкі, пакінуўшы Егіпет, вандравалі па пустыні і жылі ў такіх самых збудаваннях. Свята *Пурым* (свята Жэрабя), якое святкавалася ў канцы лютага — пачатку сакавіка, было ўсталявана ў памяць пра збаўленне яўрэяў ад знішчэння персамі.

Што тычыцца сямейнай абраднасці, то найбольш важным абрадам, супраць якога вялася актыўная прапаганда, з'яўлялася *міла* (абразанне крайняй плоці хлопчыкаў на восьмы дзень пасля нараджэння, якое сімвалізавала дамову паміж Богам і яўрэйскім народам).

У выніку ўсталявання савецкай улады ў становішчы іўдзейскага культу адбыліся пэўныя змены. Аналіз іх асаблівасцей і з'яўляецца мэтай дадзенага артыкула. Храналагічныя межы ахопліваюць студзень 1919 г. — верасень 1939 г. (ад часу ўзнікнення беларускай савецкай дзяржаўнасці да далучэння да БССР Заходняй Беларусі). Тэрытарыяльныя межы акрэслены дзяржаўнай мяжой БССР, якая ўсталявалася пасля 6 снежня 1926 г., гэта значыць, ахопліваюць у тым ліку тэрыторыі Віцебшчыны і Магілёўшчыны, а таксама Гомельшчыны, якія да 1924 г. і 1926 г. адпаведна ўваходзілі ў склад РСФСР.

Для таго каб вызначыць, наколькі выкананне іўдзейскага культу было магчымым у новых умовах, неабходна прааналізаваць спецыфіку ўзаемаадносін дзяржавы і рэлігіі ў СССР. Наконт іўдаізму савецкі рэлігіязнавец М.Шахновіч у 1930 г. адзначаў: *"ніводная рэлігія не мае столькі абрадаў, як іўдаізм. Прадпісанні Талмуда распаўсюджваюцца на ўсе выпадкі жыцця і амаль цалкам знішчаюць усялякую свабоду дзеянняў. Прыгнятальнікам неабходна адарваць бедняка ад зямнога жыцця, заглыбіць у рэлігійны кісель, прымусіць выконваць масу абрадаў, адцягнуць яго ўвагу ад зямнога да нябеснага"*. Яўрэйскія рэлігійныя святы нібыта былі *"патрэбны клерыкалам для мабілізацыі рэакцыйных сіл на барацьбу супраць сацыялізму, супраць навукі, супраць вольнай думкі, супраць культуры чалавецтва"*[3].

Савецкія агітатары-антырэлігійнікі дэманстравалі сваё адмоўнае стаўленне і да асобных яўрэйскіх святаў і абрадаў. Непрыхільнасць да іўдзейскай суботы была выклікана тым, што нібыта яна замінала росту вытворчасці працы, бо ў гэты дзень яўрэі, як правіла, не выходзілі на працу. Адмоўныя адносіны існавалі да святаў Рош-Гашана, Іом-Кіпур. На думку членаў ЦК РКП(б) і ЦК КП(б)Б, яны былі прычынай узмацнення рэлігійнай боязі ў яўрэйскім асяроддзі, бо іўдзеі верылі, што менавіта ў гэтыя дні вырашаецца іх далейшы лёс. Шкоднасць Песаху бачылася ў тым, што ён нібыта спрыяў развіццю ў яўрэяў пасіўнасці і пакорлівасці, іншымі словамі, адцягваў іх ад удзелу ў класавай барацьбе[4].

На працягу вывучаемага дваццацігоддзя ступень магчымасці выканання яўрэямі рэлігійных абрадаў змянялася. **Першым этапам трэба лічыць студзень 1919 г. — пачатак 1926 г.** У гэты час члены іўдзейскіх абшчын маглі адкрыта ажыццяўляць культавую дзейнасць, абапіраючыся на тэзіс пра свабоду веравызнання, зафіксаваны ў савецкім заканадаўстве. Адначасова яўрэйскія суполкі адчулі ціск з боку партыйных органаў, якія пачалі выпрабоўваць розныя формы антырэлігійнай агітацыі ў асяроддзі яўрэйскага насельніцтва.

Так, ужо на першым этапе яўрэі-вернікі сустрэлі перашкоды ў справе шанавання суботы. Галоўнай задачай антысуботніх кампаній было прыцягненне ў гэты дзень дарослага насельніцтва да працы*, а дзяцей — да вучобы[5]. У канцы 1921—1922 гг. антысуботнія агітацыйныя мерапрыемствы былі праведзены ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Оршы, Мазыры. У асноўным яны прымалі форму дакладаў, публікацый у перыядычным друку, зрэдку — мітынгаў[6]. У выніку на працягу жніўня—снежня 1922 г. у Магілёве, Быхаве, Рэчыцы для работнікаў-яўрэяў суботні адпачынак быў заменены адпачынкам па нядзелях, у Старых Дарогах у 1923 г. днём адпачынку была абвешчана серада[7]. Аднак яўрэі-вернікі імкнуліся выконваць традыцыі. Так, у сярэдзіне 1920-х гг. не выходзіла на працу па суботах большасць яўрэяў-рамес-

* Да гэтага часу ўсе рабочыя прамысловых прадпрыемстваў і дзяржаўных устаноў як правіла, мелі адзін выхадны дзень на тыдзень: для хрысціян гэта была нядзеля, для іўдзеяў — субота. У далейшым адзін выхадны дзень для прадстаўнікоў усіх веравызнанняў захоўваўся, але ён пераносіўся на дзень, які раней традыцыйна з'яўляўся працоўным.



Канстанцін Карпекін. Змены ў становішчы іўдзейскага культу ў БССР ва ўмовах савецкай антырэлігійнай прапаганды




*Аб'ява пра правядзенне антырэлігійнага "сярэдніка" ў свята Іом-Кіпур у Полацку.* 12 кастрычніка 1921 г. (Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 10050-п, воп. 1, спр. 351, арк. 27).

нікаў Рэчыцы. Прычым кіраўніцтва рамесніцкіх арцелей ставілася да гэтай з'явы досыць лаяльна[8].

Спробы адцягнуць маладое пакаленне ад выканання традыцый рабілі аддзелы народнай адукацыі. У прыватнасці, у пачатку 1923 г. у Віцебскай губерні выхадны дзень у школах быў перанесены з суботы на нядзелю[9], а настаўнікі Мінска звярнуліся ў Народны камісарыят асветы БССР з прапановай зрабіць днём адпачынку сераду[10]. Такія захады сустрэлі супрацьдзеянне з боку вернікаў. Напрыклад, у канцы 1922 г. частка настаўнікаў Гомеля на сваім сходзе выказалася супраць правядзення заняткаў па суботах.

Заўважым, што ў гэты час субота шанавалася не толькі членамі іўдзейскіх абшчын, але і часткай яўрэяў-камуністаў. Справа ў тым, што многія з іх паходзілі з веруючых сем'яў і атрымалі рэлігійную адукацыю, таму ім цяжка было адмовіцца ад традыцыі шанавання суботы. Нельга адмаўляць і той факт, што некаторыя камуністы выконвалі рэлігійныя абрады пад уплывам сваякоў-вернікаў. У прыватнасці, у пачатку 1926 г. у Полацку члены РКП(б) *"выходзілі нароўні з мяшчанствам, апранутыя па-суботняму, гэта значыць па-святочнаму. Былі такія, хто ў суботу не працуе, а ў савецкія святы працуюць"*[11].

Архіўныя дакументы дазваляюць меркаваць, што ў гэты час мясцовыя камітэты РКП(б) і органы ўлады адносіліся да Рош-Гашаны і Іом-Кіпура больш лаяльна, чым да суботы. Разам з тым паміж партыйцамі і вернікамі прайшла рэзкая мяжа: першыя мусілі актыўна змагацца з рэлігійнымі традыцыямі, другія ўсё ж мелі магчымасць іх выконваць. Напрыклад, 22 верасня 1920 г. у Магілёве прайшоў суботнік, які быў прымеркаваны як раз да Іом-Кіпура. На мерапрыемства абавязаны былі з'явіцца члены і кандыдаты ў члены РКП(б), РКСМ, піянеры. У выпадку няяўкі ім пагражала выключэнне з партыі і камсамола. Удзел у суботніку беспартыйных яўрэяў-рабочых і чырвонаармейцаў быў добраахвотным[12]. У кастрычніку 1921 г. у Гомелі для рабочых прадпрыемстваў быў арганізаваны дыспут з вынясеннем рэзалюцыі супраць рэлігійных святаў, у друку з'явіліся антырэлігійныя артыкулы. У восеньскую кампанію 1922 г. антырэлігійныя дэманстрацыі і мітынгі прайшлі ў Мінску, Мазыры, Гарадку, Ігумене, Віцебску і іншых беларускіх гарадах[13].

Нягледзячы на такія дзеянні партыйных камітэтаў РКП(б) і КП(б)Б, у студзені 1919 г. — пачатку 1926 г. члены іўдзейскіх абшчын у справе захавання рэлігійных традыцый абапіраліся на пастановы мясцовых органаў улады. Напрыклад, у 1920 г. у Віцебскай губерні на Рош-Гашану лічыліся выхаднымі два дні, а на Іом-Кіпур — адзін.

Заўважым, што ў падобным становішчы апынулася і абрадавая дзейнасць, звязаная з Песахам. На працягу 1919—1926 гг. як у межах БССР, так і на тэрыторыі беларускіх губерняў у складзе РСФСР існаваў феномен, калі свабода сумлення, замацаваная заканадаўча, спалучалася з атэістычнай прапагандай, скіраванай на поўную ліквідацыю рэлігіі. Напрыклад, у 1924 г. антыпесаховая кампанія, распрацаваная Віцебскім губернскім камітэтам РКП(б), прадугледжвала даклады на прадпрыемствах пра паходжанне і адмоўнае значэнне свята, клубныя вечарыны з аналагічнымі дакладамі, літаратурна-гумарыстычныя выступленні, буфанады з гумарэскамі, заснаванымі на мясцовым матэрыяле[14]. Мінскі акруговы выканкам у 1926 г. на першае месца паставіў агітацыю супраць выпечкі мацы[15]. У мястэчках антыпесаховыя мерапрыемствы разгортваліся не так актыўна, як у гарадах. Напрыклад, можна меркаваць, што антырэлігійная кампанія ў Копысі вясной 1923 г. не выклікала асаблівай зацікаўленасці з боку яўрэяў, паколькі мерапрыемствы былі вельмі аднастайныя і праводзіліся толькі ў форме дакладаў. Падобная сітуацыя назіралася і ў мястэчку Крупкі. Там 8 красавіка 1924 г. быў прачытаны адзін даклад пра паходжанне рэлігіі і Песаху.

Разам з тым у 1919 г. — пачатку 1926 г. іўдзеі мелі магчымасць адзначаць Песах, бо для вернікаў былі абвешчаны непрацоўныя дні. Так, у межах Магілёўскага павета ў 1921 г. у сувязі з надыходам свята былі зроблены выхаднымі днямі 23 і 24 красавіка, а 22 красавіка яўрэі маглі працаваць да 12-ці гадзін[16], тое ж было ў Лядах у 1925 г.[17]. Пры гэтым у афіцыйных губернскіх газетах з'яўляліся аб'явы пра продаж песаховага віна, дазволенага да ўжытку рабінамі, і пра магчымасць заказаць яго ў любы горад ці мястэчка. Гэта было характэрна для Віцебскай[18] і Гомельскай губерняў.

Нягледзячы на правядзенне антырэлігійных кампаній, у 1919 г. — пачатку 1926 г. іўдзеі мелі магчымасць вырабляць на Песах мацу шляхам арганізацыі спецыяльных арцелей. Як правіла, такія арцелі ствараліся ў першыя дні свята, працавалі на працягу ўсяго Песаху, а потым закрываліся да наступнай вясны. Вядома, што падобныя арцелі працавалі ў 1922 г. у Гомельскай губерні[19]. У Віцебску ў тым жа годзе меліся 3 арцелі: першая выпякала мацу з 14 да 21 красавіка, другая і трэцяя — з 13 да 22 красавіка, у кожнай з іх было па 8 работнікаў[20]. Калі на тэ-

рыторыі РСФСР дазвалялася функцыянаванне такіх арцелей, то ўрад БССР праводзіў мерапрыемствы па скарачэнні ўжывання мацы. Так, у 1925 г. было адмоўлена ў рэгістрацыі "Саюзу прыхаджан яўрэйскіх сінагог і малітоўных дамоў г. Бабруйска". Адной з прычын адмовы было тое, што сярод мэт арганізацыі значылася забеспячэнне вернікаў мацой.

Астатнія іўдзейскія святы не падвергліся такому ціску з боку партыйных органаў, як Рош-Гашана, Іом-Кіпур і Песах, паколькі не лічыліся вельмі ўплывовымі. Напрыклад, Віцебскі губкам РКП(б) у 1922 г. вырашыў абмежавацца толькі забаронай святкавання Пурыма[21]. У чэрвені 1925 г., напярэдадні свята Сукот, па Віцебску былі прачытаны ўсяго 4 антырэлігійныя лекцыі і праведзена 1 вечарына[22].

Калі ў першай палове 1920-х гг. партыйнае кіраўніцтва БССР і РСФСР яшчэ не выпрацавала дакладных метадаў змагання з іўдзейскімі святамі і абрадамі, то з красавіка 1926 г. становішча яўрэйскага культу пагоршылася, што было звязана ў першую чаргу са стварэннем масавай атэістычнай арганізацыі "Саюз бязбожнікаў"*. Гэтую падзею трэба лічыць пачаткам другога этапа ў працэсе змены становішча іўдзейскага культу, які завяршыўся ў пачатку 1929 г. У азначаны час выкананне абрадаў усё больш ускладнялася антыіўдзейскай агітацыяй, якая набывала акрэсленыя формы.

Падчас другога этапу, у **красавіку 1926 г. — пачатку 1929 г.**, актыўна праводзіліся мерапрыемствы супраць шанавання суботы. Іўдзеі не здолелі супрацьстаяць тактыцы ЦК КП(б)Б і ўрада БССР. Яны фактычна былі пастаўлены перад выбарам: альбо адмовіцца ад гэтай рэлігійнай традыцыі, альбо страціць працу, а значыць і сродкі для існавання. Так, у 1929 г. у Багушэўску днём адпачынку для яўрэяў афіцыйна была абвешчана пятніца, а ў Горках — панядзелак[23]. Як вынік, у канцы 1920-х гг. многія яўрэйскія секцыі** акруговых камітэтаў КП(б)Б адзначалі як важнае дасягненне тое, што амаль усе яўрэі выходзілі на працу па суботах і не выказвалі незадаволенасці гэтым.




*Аб'ява пра продаж песаховага віна ў Віцебску, змешчаная 29 сакавіка 1924 г. у газеце "Известия Витебского Угоркома РКП и Угорисполкома".*

У складаных умовах праходзіла і культавая дзейнасць іўдзеяў падчас Рош-Гашаны і Іом-Кіпура. У 1926 г. напярэдадні мерапрыемстваў, скіраваных супраць гэтых святаў, яўрэйскае бюро ЦК КП(б)Б давала сваім агітатарам рэкамендацыі наступнага зместу: *"Мы павінны напружыць усе сілы, каб гэтая кампанія была праведзена з поспехам, каб уцягнуць шырокія масы рабочых саматужных арцелей і калгасаў. Трэба прыцягнуць да гэтай працы прафсаюзы, саматужную кааперацыю"*[24]. У такім рэчышчы ў тым жа годзе прайшла маштабная кампанія ў Віцебску: напярэдадні Іом-Кіпура ў адным з клубаў горада для яўрэйскіх саматужнікаў была арганізавана вечарына пытанняў і адказаў, дзе абмяркоўваліся рэлігійныя пытанні, а таксама праблемы міжнароднага становішча, іншыя тэмы, якія цікавілі рабочых. Завяршылася вечарына спектаклем, падрыхтаваным піянерамі. Раніцай наступнага дня для рабочых была праведзена экскурсія па Віцебскім акруговым музеі[25]. У 1928 г. у Лядах былі зачытаны даклады, пасля якіх частка яўрэйскага насельніцтва прыняла на сваім сходзе рэзалюцыю пра закрыццё трох сінагог і абвяшчэнне дзён восеньскіх святаў працоўнымі днямі.

У правядзенні антыпесаховых кампаній гэтага часу таксама заўважаюцца новыя падыходы. З другой паловы 1920-х гг. перавага аддавалася больш стрыманай агітацыі: зменшылася выкарыстанне такіх форм, як шумныя дэманстрацыі, карыкатуры на старонках газет і часопісаў. Гэта было звязана ў першую чаргу з нежаданнем урада быць абвінавачаным з боку іншых дзяржаў у прыцясненні рэлігіі. Кіраўніцтва СССР імкнулася стварыць ілюзію таго, што ў краіне існуе свабода сумлення, калі кожны мае права і на спавяданне любой рэлігіі, і на атэістычную прапаганду. Адметным момантам стала і тое, што пачынаючы з 1926 г. члены яўрэйскай секцыі КП(б)Б выкарыстоўвалі антыпесаховыя кампаніі для стварэння новых ячэек Саюза бязбожнікаў, набору ў саюз новых членаў, арганізацыі падпіскі на антырэлігійныя выданні[26].

Характэрным для другога этапа стала і тое, што антыпесаховыя кампаніі пачалі праводзіцца не толькі ў буйных, але і ў невялікіх гарадах і мястэчках, гэта значыць, ахоплівалі большую колькасць яўрэйскага насельніцтва. Напрыклад, у красавіку 1926 г. у

* У чэрвені 1929 г. Саюз бязбожнікаў быў перайменаваны ў Саюз ваяўнічых бязбожнікаў (СВБ).

** Яўрэйскія секцыі былі створаны пры камітэтах РКП(б) усіх узроўняў у 1918 г. і праіснавалі да 1930 г. У іх кампетэнцыю ўваходзіла ажыццяўленне савецкай палітыкі ў асяроддзі яўрэйскага насельніцтва.

Сіроціне адбыўся вечар з агітацыйнымі дакладамі, у Шуміліне — вечарына пытанняў і адказаў. Шмат розных мерапрыемстваў мела месца ў 1928 г. у Круглым і Копысі. Тут былі праведзены вечарыны з дакладамі, тэатралізаванымі пастаноўкамі і дэкламацыямі вершаў, гутаркі, танцы, харавыя і фізкультурныя выступленні[27].

Нагадаем, што для вернікаў важным святочным атрыбутам з'яўлялася маца, таму ў красавіку 1926 г. — пачатку 1929 г. ЦК КП(б)Б надаваў вялікае значэнне абмежаванню яе вырабу. У сувязі з гэтым у БССР пачалося мэтанакіраванае выяўленне партыйцаў, камсамольцаў і іх сваякоў, якія ўжывалі мацу. Так, у Оршы ў 1928 г. было выяўлена 8 такіх асоб: трое камсамольцаў былі выключаны з ЛКСМБ, астатнім зроблены вымовы. У Віцебску ў 1929 г. гарадскія ўлады забаранілі дзейнасць арцелі, якія займаліся выпечкай мацы[28]. Яшчэ адной прычынай пагаршэння стану яўрэйскіх рэлігійных суполак стала абмежаванне ўвозу ў рэспубліку мукі і гатовага печыва з-за мяжы.

Адзначым, што побач з актывізацыяй барацьбы са святамі Рош-Гашана, Іом-Кіпур і Песах у 1926 г. — пачатку 1929 г. зменшылася колькасць кампаній, скіраваных супраць астатніх іўдзейскіх святаў. Менавіта ў гэты перыяд вызначылася тэндэнцыя фармальнага падыходу да атэістычнай працы, калі яна пачала праводзіцца эпізадычна — восенню і вясной.

Нягледзячы на антырэлігійную палітыку, яўрэі не адыходзілі ад традыцыйнай сямейнай абраднасці. У пэўнай ступені выконваць яе было прасцей, чым каляндарную. У прыватнасці, абразанне заставалася папулярным нават у асяроддзі камуністаў па той прычыне, што яго можна было рабіць таемна, не парушаючы пры гэтым працоўную дысцыпліну. Факты правядзення гэтага абраду мелі месца ў 1927 г. у Віцебску[29], Тураве, Жлобіне, Глуску, Рагачове[30]. Захоўвалася і спраўленне вяселляў паводле іўдзейскіх правілаў. Здараліся выпадкі, калі дзеля наладжвання традыцыйнага вяселля камуністы добраахвотна выходзілі з КП(б)Б, тлумачачы гэта тым, што іх нявесты супраць партыйнасці сваіх жаніхоў.

Ва ўмовах узмацнення антырэлігійнай палітыкі адбывалася далейшае пагаршэнне становішча іўдзейскага культу. **Трэці этап ахапіў студзень 1929 г. — пачатак 1937 г.**

24 студзеня 1929 г. ЦК ВКП(б) прыняў сакрэтную пастанову "Аб мерах па ўзмацненні антырэлігійнай працы", дзе галоўным недахопам антырэлігійнай працы была названа яе несістэматычнасць. З мэтай выпраўлення сітуацыі ЦК ВКП(б) загадаў прыцягнуць да ўдзелу ў антырэлігійнай прапагандзе шырокую грамадскасць[31]. У пачатку 1930 г. у складзе партыі былі ліквідаваны яўрэйскія секцыі, таму адзінай арганізацыяй, якая спецыялізавалася менавіта на антыіўдзейскай дзейнасці, аказаўся Саюз ваяўнічых бязбожнікаў, у складзе якога нацыянальныя аддзелы захаваліся. У сувязі з правядзеннем індустрыялізацыі і масавай калектывізацыі рэлігійныя святы пачалі разглядацца як з'явы, што замінаюць эканамічнай палітыцы дзяржавы, перашкаджаюць узрастанню моцы СССР.

Антырэлігійныя кампаніі былі прасякнуты меркаваннем, што падчас іўдзейскіх святаў яўрэі абавязкова павінны працаваць. Неад'емнымі элементамі агітацыйных мерапрыемстваў сталі заклікі працаваць у святочныя дні, удзельнічаць у суботніках, адлічваць частку заробку ў "фонд індустрыялізацыі". Адмова ад удзелу ў такіх кампаніях успрымалася не толькі як схільнасць да старога, рэлігійнага, светапогляду, але і як імкненне перашкодзіць росту эканамічнай моцы Савецкага Саюза. Так, у адным з агітацыйных артыкулаў, змешчаных восенню 1930 г. у віцебскай акруговай газеце "Віцебскі пралетарый", адзначалася: *"класавы вораг пад маскай рабіна, кантара сінагог будзе адцягваць увагу працоўнага рэлігійнага яўрэя ад непасрэдных задач сацыялістычнага будаўніцтва, ад выканання прамфінплана, ад распаўсюджвання пазыкі "Пяцігодка — за чатыры гады"*[32]. У дадзеным прыкладзе відавочна супрацьпастаўленне святочных традыцый эканамічнаму развіццю рэспублікі.

На прыкладзе антысвяточнай кампаніі ў верасні 1932 г. у Дубровенскім раёне бачна, якія мэты пераважалі падчас такіх мерапрыемстваў. Па-першае, неабходна было тлумачыць насельніцтву адмоўную ролю рэлігіі ў жыцці грамадства; па-другое, імкнуцца да стопрацэнтнага выхаду на працу ва ўсіх установах і прадпрыемствах; па-трэцяе, пасьпяхова выконваць гаспадарчы план развіцця рэспублікі. У гэты час пачало шырока практыкавацца правядзенне сацыялістычных спаборніцтваў, збораў грашовых сродкаў для разгортвання індустрыялізацыі[33].

У 1930-я гг. кіраўнікі прадпрыемстваў пачалі заахвочваць рабочых, якія працавалі ў святочныя дні. Напрыклад, у Бабруйску ў прыклад усім яўрэям ставілася 60-гадовая рабочая арцелі "Вяровачнік" Г.Вігдорчык, якая восенню 1935 г. працавала падчас Рош-Гашаны і Іом-Кіпура і выканала свой вытворчы план на 110%. Пры гэтым якасць яе прадукцыі знаходзілася на высокім узроўні[34]. Папулярызацыя такіх паводзін мела на мэце стварэнне прыкладу для астатніх яўрэяў, дэманстрацыю таго, што іўдзейскіх традыцый прытрымліваюцца не ўсе прадстаўнікі старэйшага пакалення.

Узмацненне атэістычнай працы адбілася і на святкаванні Песаху. Вернікі ў чарговы раз сутыкнуліся з тым, што КП(б)Б настойвала на вынішчэнні рэлігіі, якая нібыта магла адыгрываць толькі адмоўную ролю для грамадства і замаруджваць развіццё эканомікі і культуры. Напрыклад, мерапрыемствы супраць свята прайшлі вясной 1929 г. у Стрэшыне. Настаўнікі мясцовай яўрэйскай школы абмеркавалі з вучнямі і іх бацькамі шэраг тэм ("Паходжанне Песаху і легенды пра свята", "Шкоднасць мацы для здароўя чалавека", "Ці гістарычная асоба Маісей?", "Розніца паміж 1 Мая і Песахам"). Мэтай гэтых дыскусій было пераканаць вернікаў у перавазе новага, савецкага побыту над традыцыйным. У другі і восьмы (апошні) ве-




*Талерка для песаховай трапезы, выраблeная ў 1930 г. у Барысаве.* Выява паводле выдання: Киржниц А. Трудящиеся евреи в борьбе с религией (Из итогов 1929—1930 гг.). М., 1931. С. 68.

чары свята ў мястэчку адбыліся антырэлігійныя мерапрыемствы як для дзяцей, так і для дарослых[35].

Магілёўскі акруговы камітэт КП(б)Б у 1930 г. адзначаў, што антырэлігійныя кампаніі павінны даносіць да яўрэяў несумяшчальнасць Песаху і індустрыялізацыі. Важным элементам антыпесаховай кампаніі стала наладжванне бесперапыннага працоўнага тыдня ў дні свята. Атрыманыя грошы рабочыя павінны былі адлічыць "на стварэнне эскадрыллі"[36]. У рэчышчы праводзімай палітыкі ў 1933 г. Цэнтральны савет Саюза ваяўнічых бязбожнікаў БССР абвясціў па ўсёй рэспубліцы лозунг "Супраць пасхі, за бальшавіцкую сяўбу". Ён тычыўся ў тым ліку і іўдзейскага Песаху[37].

Дастаткова складанай справай для яўрэяў-вернікаў станавілася выпечка мацы. На працягу 1929 г. — пачатку 1937 г. кампаніі супраць гэтай традыцыі праводзіліся ў дзвюх асноўных формах: агітацыя праз перыядычныя выданні і пакаранне асоб, якія выраблялі печыва. У прыватнасці, у газеце "Акцябр" у 1936 г. была апублікавана гісторыя пра тое, як адзін яўрэй атрымаў з Рыгі пакунак мацы. Але да таго часу ён ужо не прызнаваў рэлігійных традыцый, таму скарміў яе хатняй жывёле. Артыкул быў прасякнуты думкай пра тое, што выкананне рэлігійных абрадаў замінае дабрабыту рабочых, таму трэба адмаўляцца ад старога светапогляду[38].

Выяўленне асоб, якія выраблялі мацу, праводзілася па ўсёй рэспубліцы. Так, напрыклад, вясной 1934 г. у Касцюковіцкім раёне было выяўлена, што прыхільнікамі рэлігійных традыцый з'яўляліся 3 члены мясцовага гарсавета, 2 камсамольцы, а таксама 29 сямей з яўрэйскага нацыянальнага калгаса[39]. Такім чынам, яўрэйскае насельніцтва па-ранейшаму ўжывала мацу на Песах. Больш за тое, марудна адыходзілі ад такіх абрадаў нават савецкія служачыя, камуністы і камсамольцы. Абмежаванне выпечкі мацы ў БССР прывяло да таго, што яе пачалі дастаўляць сюды з-за межаў рэспублікі. У прыватнасці, гэтай справай займаўся Ёсаф Іцхак Шнеерсон — прадстаўнік дынастыі любавіцкіх цадзікаў*, які на той час жыў у Рызе[40].

У 1929 г. — пачатку 1937 г. прадаўжала ўскладняцца сітуацыя вакол сямейнай іўдзейскай абраднасці. Найбольш трывала ў гэты час у іўдзейскім асяроддзі захоўваўся абрад абразання. Вернікі вельмі неахвотна адмаўляліся ад абраду, які сведчыў пра адметнасць яўрэяў сярод іншых народаў. Агітацыйна-масавы аддзел ЦК КП(б)Б быў занепакоены моцнымі пазіцыямі гэтага абраду і актывізаваў барацьбу супраць яго. Так, у 1931 г. быў выяўлены выпадак смерці сына аднаго з рабочых мінскай фабрыкі "Кастрычнік". Прычынай смерці было прызнана абразанне, і для ўкаранення адмоўнага стаўлення да абраду ў горадзе быў наладжаны дыспут. Два выпадкі смяротнага зыходу пасля здзяйснення абразання былі зафіксаваны ў Мінску ў 1932 г. У тым жа годзе ў Гомелі былі выяўлены 3 выпадкі абразання нованароджаных хлопчыкаў, прычым бацькі двух з іх з'яўляліся кандыдатамі ў члены партыі. У якасці пакарання яны былі выключаны з радоў КП(б)Б[41]. Але, нават сутыкнуўшыся са строгімі мерамі супрацьдзеяння, яўрэі-вернікі імкнуліся захаваць традыцыю. Так, у сярэдзіне 1930-х гг. у Тураве абрад абразання быў распаўсюджаны нават у асяроддзі савецкіх служачых і настаўнікаў[42].

**Чацвёрты этап** змянення становішча іўдзейскага культу ў БССР ва ўмовах антырэлігійнай прапаганды доўжыўся **з лютага 1937 г. да верасня 1939 г.** Характэрнай рысай дзейнасці яўрэйскіх рэлігійных суполак гэтага часу было яе некаторае ажыўленне, абумоўленае аслабленнем атэістычнай працы з боку КП(б)Б.

Нягледзячы на тое, што ў Канстытуцыі БССР 1937 г. была абвешчана свабода адпраўлення рэлігійных культаў, ЦК КП(б)Б загадваў партыйным камітэтам усіх узроўняў узмацніць антырэлігійную агітацыю ў рэспубліцы. Нарматыўнай базай для гэтага сталі два дакументы: пастанова бюро ЦК КП(б)Б "Аб становішчы антырэлігійнай прапаганды ў Беларусі" ад 7 кастрычніка 1937 г. і рашэнне "Аб узмацненні антырэлігійнай прапаганды і агітацыі ў Беларусі" ад 28 кастрычніка 1938 г. У іх ЦК партыі адзначыў, што да гэтага часу антырэлігійная прапаганда ў Беларусі недаацэнь-

* Цадзікамі ("праведнікамі") называлі лідараў хасідскіх абшчын, якія лічыліся пасрэднікамі паміж вернікамі і Богам. Яны здабывалі свой аўтарытэт не столькі вучонасцю, колькі харызмай і асабістымі якасцямі. У Беларусі такая плынь іўдаізму, як хасідызм, была прадстаўлена некалькімі школамі, адной з якіх з'яўлялася любавіцкая. Яна была заснавана ў канцы XVIII ст., а назву атрымала ад месцазнаходжання рэзідэнцыі свайго заснавальніка Шнеўра Залмана — у мястэчку Любавічы (цяпер вёска ў Руднянскім раёне Смаленскай вобласці Расійскай Федэрацыі).

валася, а таму на працягу апошніх некалькіх гадоў у рэспубліцы яна ўвогуле не вялася. Акрамя таго, ЦК КП(б)Б ставіў у віну сваім нізавым структурам тое, што яны не праводзілі падрыхтоўкі агітатараў-антырэлігійнікаў і ў шэрагу раёнаў (напрыклад, у Слуцкім, Жлобінскім, Камарынскім і інш.) дапусцілі знікненне саветаў і ячэек Саюза ваяўнічых бязбожнікаў[43].

На самай справе, як адзначалася вышэй, у сярэдзіне 1930-х гг. у БССР пэўная антырэлігійная праца ўсё ж праводзілася, але яе было недастаткова, каб прымусіць яўрэяў-вернікаў адмовіцца ад рэлігійных традыцый. У гэты час у гарадах і мястэчках БССР іўдзейскія абшчыны прадаўжалі функцыянаваць досыць актыўна, пра што мясцовыя партыйныя камітэты не раз паведамлялі ў ЦК КП(б)Б, канстатуючы тым самым уласнае бяссілле. У сваю чаргу партыйнае кіраўніцтва рэспублікі ўспрымала гэта як поўную адсутнасць антырэлігійнай прапаганды.

Моцная крытыка з Мінска аказала адмоўны ўплыў на дзейнасць мясцовых партыйных камітэтаў: яны сталі пазбягаць масавых агітацыйных мерапрыемстваў, засяродзіліся на выяўленні выпадкаў выканання яўрэямі рэлігійных абрадаў і традыцый, і не наладжвалі арганізаванага супрацьдзеяння іўдзейскім абшчынам. Яшчэ адной прычынай гэтай з'явы трэба лічыць тое, што ЦК КП(б)Б і Цэнтральны савет Саюза ваяўнічых бязбожнікаў аказвалі вельмі слабую дапамогу сваім першасным арганізацыям. У прыватнасці, у канцы 1930-х гг. спынілася фінансаванне дзейнасці саюза. Акрамя таго, камітэты КП(б)Б і саветы СВБ мелі слабое метадычнае забеспячэнне. Так, за канец 1937 г. — ліпень 1938 г. невялікім накладам былі падрыхтаваны толькі падручнікі для антырэлігійных гурткоў (на ўсю рэспубліку — каля 500 асобнікаў), а таксама было перавыдадзена некалькі найменняў атэістычных брашур.

У такой сітуацыі пэўныя намаганні прыкладалі толькі рэспубліканскія арганізацыі. Напрыклад, вечарам 14 верасня 1937 г. з Мінска трансліравалася радыёлекцыя акадэміка М.Нікольскага "Каму і для чаго патрэбны восеньскія яўрэйскія святы?". Яна ў чарговы раз засведчыла негатыўнае стаўленне партыйнага кіраўніцтва да іўдзейскіх традыцый (прамоўца назваў служыцеляў культу і вернікаў "ворагамі народу", "наймітамі фашызму")[44].

Прыняцце новай Канстытуцыі БССР, фактычная бяздзейнасць партыйных камітэтаў і Саюза ваяўнічых бязбожнікаў у справе антырэлігійнай прапаганды ў канцы 1930-х гг. далі магчымасць іўдзейскім абшчынам разгарнуць сваю дзейнасць. У лютым 1937 г. — верасні 1939 г. іўдзеі прадаўжалі шанаваць суботнюю традыцыю (найбольш яскрава гэта выявілася ў Лёзне, Любані). Вясной 1937 г. масавая выпечка мацы мела месца ў Касцюковіцкім раёне. Таксама на адной з фабрык Віцебска беспартыйныя рабочыя не толькі самі выраблялі мацу, але і частавалі ёй дзвюх камсамолак. Ажыццяўленне яўрэйскіх святочных абрадаў было распаўсюджанай з'явай у канцы 1930-х гг. у Магілёве[45].

Адзінкавыя антырэлігійныя мерапрыемствы, якія праводзіліся ў канцы 1930-х гг., не маглі аказаць моцнага ўплыву на сямейную абраднасць яўрэяў. Як і ў папярэдні час, найбольш трывалым з'яўляўся абрад абразання. Даволі частымі былі выпадкі выканання дадзенага абраду ў асяроддзі рабочых віцебскай фабрыкі "Сцяг індустрыялізацыі", меліся такія факты ў 1937 г. у Лёзне[46]. У красавіку 1937 г. абразанне зрабілі яўрэйскаму хлопчыку ў Асвеі. Пры гэтым бацькі дзіцяці з'яўляліся камсамольцамі (маці была старшай піянерважатай, а бацька — настаўнікам у адной са школ горада)[47]. У 1939 г. абрад абразання актыўна праводзіўся ў асяроддзі яўрэяў-рабочых Мінска[48].

Такім чынам, на працягу даследуемага дваццаціглоддзя дзейнасць іўдзеяў па сваіх выкананні рэлігійных абрадаў абумоўлівалася савецкай канфесійнай палітыкай. З аднаго боку, іўдзейскія абшчыны імкнуліся карыстацца афіцыйна замацаванай у савецкім заканадаўстве свабодай сумлення, з іншага — становішча іўдзейскага культу ўскладнялася дзейнасцю партыйных камітэтаў, якія ўзялі на сябе абавязак трансфарміраваць светапогляд яўрэйскага насельніцтва з рэлігійнага ў атэістычны. Дадзеныя працэсы праходзілі ў некалькі этапаў: 1) у студзені 1919 г. — пачатку 1926 г. члены іўдзейскіх абшчын мелі магчымасць дастаткова свабодна выконваць рэлігійныя абрады, а РКП(б) і КП(б)Б выпрабоўвалі розныя формы антыіўдзейскай працы: ад грубай зняважы іўдзейскіх традыцый да спроб пераканаць яўрэяў-вернікаў у нелагічнасці рэлігійных вераванняў; 2) у красавіку 1926 г. — пачатку 1929 г. стан іўдзейскага культу пагоршыўся ў сувязі з узмацненнем антырэлігійнай прапаганды, якая праводзілася не толькі КП(б)Б, але і Саюзам ваяўнічых бязбожнікаў, 3) у студзені 1929 г. — пачатку 1937 г. антыіўдзейская прапаганда ў БССР набыла спецыфічную афарбоўку ў сувязі з правядзеннем у рэспубліцы індустрыялізацыі і масавай калектывізацыі, а праца антырэлігійнікаў была зведзена да мерапрыемстваў супраць рэлігійных святаў і традыцый, прызнаных найбольш шкоднымі для яўрэйскага насельніцтва, а астатнія святы і традыцыі падвяргаліся меншаму атэістычнаму ўздзеянню, 4) у лютым 1937 г. — верасні 1939 г. у іўдзейскім асяроддзі ажывілася культавая дзейнасць, што было выклікана фактам прыняцця Канстытуцыі БССР, а таксама няўдалымі спробамі ЦК КП(б)Б ажывіць антырэлігійную прапаганду ў рэспубліцы. Указаныя працэсы сведчаць пра тое, што антыіўдзейская праца КП(б)Б не прынесла чакаемых вынікаў, і ў яўрэйскім асяроддзі ў 1919—1939 гг. актыўна захоўвалася як каляндарная, так і сямейная абраднасць.

---

[1] Пропаганда и агитация в решениях и документах ВКП(б). М., 1947. С. 133.

[2] Статыстычны штогоднік. 1923—1924. Мінск, 1925. С. 3.

[3] Шахнович М.И. Кому служит "религия Израиля". Л., 1930. С. 71—72.

[4] И.Р.Предпасхальное // Известия Витебского губисполкома и губкома РКП(б). 1924, 16 марта; Мардерштейн И.Г.

Пасха. [Сталин], 1928; Шахнович М.И. Кому служит "религия Израиля". Л., 1930.

[5] Против двухдневного отдыха // Полесская правда. 1921, 7 октября. С. 3.

[6] Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (далей — ДАВВ). Ф. 10050-п, воп. 1, спр. 347, арк. 27.

[7] Ш-н М. День отдыха — среда // Коммунист. 1923, 4 мая. С. 1.

[8] Каганович А. Речица. История еврейского местечка Юго-Восточной Беларуси. Иерусалим, 2007. С. 263—264.

[9] ДАВВ. Ф. 160, воп. 1, спр. 40, арк. 8.

[10] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Ф. 42, воп. 1, спр. 212, арк. 75.

[11] ДАВВ. Ф. 10061-п, воп. 1, спр. 440, арк. 21.

[12] Внеочередной субботник // Соха и молот. 1920, 21 сентября. С. 1.

[13] ДАВВ. Ф. 7-п, воп. 2а, спр. 149, арк. 45.

[14] Там жа. Ф. 10051-п, воп. 1, спр. 245, арк. 1.

[15] Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. Ф. 144-п, воп. 1, спр. 22, арк. 53.

[16] Праздничные дни // Соха и молот. 1921, 24 апреля. С. 2.

[17] ДАВВ. Ф. 10085-п, воп. 1, спр. 144, арк. 1 — 1 адв.

[18] Известия Витебского Угоркома РКП(б) и Угорисполкома. 1924, 29 марта. С. 6.

[19] О порядке найма рабочих для выпечки мацы // Полесская правда. 1922, 26 февраля. С. 4.

[20] ДАВВ. Ф. 2209, воп. 1, спр. 328—330.

[21] Там жа. Ф. 246, воп. 1, спр. 324, арк. 20 адв.

[22] НАРБ. Ф. 4-п, воп. 1, спр. 12947, арк. 675.

[23] ДАВВ. Ф. 10062-п, воп. 1, спр. 489, арк. 507.

[24] Там жа. Спр. 606, арк. 159.

[25] Бейлинсон Б. Иом-Кипур у кустарей // Заря Запада. 1926, 23 сент. С. 3.

[26] ДАВВ. Ф. 10062-п, воп. 1, спр. 333, арк. 149.

[27] Там жа. Спр. 489, арк. 154, 160.

[28] Хомечный. Новоиспечённая артель // Заря Запада. 1929, 29 марта. С. 2.

[29] ДАВВ. Ф. 10051-п, воп. 1, спр. 677, арк. 121.

[30] НАРБ. Ф. 4-п, воп. 1, спр. 2424, арк. 167, 195.

[31] ДАВВ. Ф. 10051-п, воп. 1, спр. 585, арк. 36—38.

[32] Блатнэр А. На барацьбу з рэлігійным дурманам // Віцебскі пролетары. 1930, 20 верасня. С. 4.

[33] ДАВВ. Ф. 7-п, воп. 2а, спр. 51, арк. 253.

[34] Рабкін А. Весці сістэматычную антырэлігійную працу // Комуніст. 1935, 11 кастрычніка. С. 2.

[35] Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 835, воп. 1, спр. 1, арк. 5—5 адв.

[36] Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці. Ф. 6577, воп. 1, спр. 845, арк. 248—248 адв.

[37] НАРБ. Ф. 261, воп. 1, спр. 28, арк. 5.

[38] Вылазка клерикалов и отпор рабочих масс // Антирелигиозник. 1936, № 3. С. 41.

[39] НАРБ. Ф. 261, воп. 1, спр. 30, арк. 2.

[40] Окунь Б. Барацьба супраць яўрэйскай рэлігіі // Віцебскі рабочы. 1929, 11 мая. С.1.

[41] НАРБ. Ф. 261, воп. 1, спр. 14, арк. 16, 33.

[42] Смиловитский Л. Евреи в Турове: история местечка Мозырского Полесья. Иерусалим, 2008. С. 540.

[43] НАРБ. Ф. 4-п, воп. 1, спр. 12475, арк. 21, 24, 158.

[44] Там жа. Спр. 11852, арк. 63—71.

[45] История Могилёвского еврейства: документы и люди: научно-популярные очерки и жизнеописания. Кн. 2, ч. 1. Минск, 2006. С. 130.

[46] НАРБ. Ф. 4-п, воп. 1, спр. 12099, арк. 379.

[47] ДАВВ. Ф. 10063-п, воп. 1, спр. 62, арк. 232.

[48] НАРБ. Ф. 4-п, воп. 1, спр. 13897, арк. 8.